## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «Фестываль «Панарама» дае магчымасць быць сведкам тэатральных эксперыментаў і наватарскіх ідэй»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў IV Міжнароднага фестывалю тэатральнага мастацтва «Панарама» з яго адкрыццём.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта свята ўжо стала неад'емнай часткай культурнага жыцця краіны і заваявала многіх паклоннікаў сярод гледачоў. Фестывальныя мерапрыемствы дораць беларускім аматарам мастацтва ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з разнастайнымі напрамкамі развіцця сусветнага тэатра, убачыць лепшыя пастаноўкі выдатных айчынных і замежных рэжысёраў, быць сведкам яркіх эксперыментаў і ўвасаблення наватарскіх ідэй.

«Упэўнены, што гэты форум ператворыцца ў сапраўдную панараму сучаснага тэатральнага мастацтва, дапаможа майстрам сцэны з розных краін абмяняцца творчым вопытам і будзе садзейнічаць далейшаму пашырэнню міжнароднага культурнага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Прэзідэнт.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**ДА ПАЧАТКУ ПЕРАПІСУ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў НАШАЙ КРАІНЕ ЗАСТАЛОСЯ 6 ДЗЁН**

**Усе пытанні, што ўзнікаюць па яго правядзенні, можна ўдакладніць па наступных тэлефонах:**

***8 801 100 30 30*** *(званкі для насельніцтва бясплатныя), а таксама ў гарадах:*

| | |
|---|---|
| г. Брэст | 8 0162 20 53 90, 8 0162 20 31 88 |
| г. Віцебск | 8 0212 42 54 37 |
| г. Гомель | 8 0232 74 57 25 |
| г. Гродна | 8 0152 41 78 15 |
| г. Мінск | 8 017 294 55 45 |
| г. Магілёў | 8 0222 22 49 19 |

## Сяргей Сідорскі выказаў заклапочанасць істотным падзеннем беларуска-расійскага тавараабароту

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў час сустрэчы з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным, што прайшла ў падмаскоўнай рэзідэнцыі Нова-Агарова, выказаў заклапочанасць істотным зніжэннем беларуска-расійскага тавараабароту.**

«За 8 месяцаў гэтага года зафіксавана значнае падзенне тавараабароту паміж Беларуссю і Расіяй — больш за 40 працэнтаў», — канстатаваў беларускі прэм'ер. Паводле яго ацэнкі, цяперашні аб'ём тавараабароту знізіўся да ўзроўню 2005 года. Пры гэтым падзенне ВУП у дзвюх краінах значна меншае, а сітуацыя ў беларускай і расійскай эканоміцы ўсяляе аптымізм. Акрамя пытанняў узаемнага гандлю кіраўнік беларускага ўрада прапанаваў абмеркаваць шэраг бягучых пытанняў, у тым ліку па пастаўках нафты. Сяргей Сідорскі паведаміў, што беларускі бок распрацаваў праграму супрацоўніцтва з Расіяй у паліўна-энергетычным комплексе, якая цяпер знаходзіцца на разглядзе расійскага боку. Акрамя таго, на сустрэчы былі абмеркаваныя пытанні, якія намечана ўключыць у парадак дня бліжэйшага пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы.

Пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы пройдзе ў канцы кастрычніка ў Маскве, паведаміў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін падчас сустрэчы з прэм'ер-міністрам Беларусі Сяргеем Сідорскім.

Уладзімір Пуцін дадаў, што ў снежні намечана правесці пасяджэнне Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы.

«Сёння мы мелі магчымасць у рабочым парадку абмяняцца інфармацыяй аб тым, як развіваецца эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі», — сказаў Уладзімір Пуцін. На яго думку, нягледзячы на крызісныя з'явы, аб'ём беларуска-расійскага тавараабароту паступова аднаўляецца. Прэм'ер-міністр РФ падкрэсліў, што Беларусь — найбуйнейшы пастаўшчык на расійскі рынак шэрагу тавараў, перш за ўсё сельгаспрадукцыі. Расійскі бок прыняў рашэнне аб прырыўнаванні беларускіх пастаўшчыкоў да расійскіх пры правядзенні дзяржаўных закупак.

**БЕЛТА.**

## Трэцяя аперацыя па роднаснай трансплантацыі нырак дзіцяці прайшла ў Беларусі



**Пацыентам стаў падлетак ва ўзросце 15 гадоў з Бабруйска, паведаміў галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па нефралогіі і ырачна-замяшчальнай тэрапіі кандыдат медыцынскіх навук Алег КАЛАЧЫК.**

У аперацыі прымалі ўдзел адразу дзве ўстановы аховы здароўя Мінска. Донарская нефрэктамія (забор органа) праводзілася ў аддзяленні перасадкі ныркі 4-й гарадской клінічнай бальніцы імя М.Я. Саўчанкі. Потым трансплантат даставілі ў 2-ю дзіцячую гарадскую клінічную бальніцу, дзе і прайшла аперацыя. Донарам для хлопчыка стаў яго бацька.

Паводле слоў Алега Калачыка, у пацыента былі шматлікія анамаліі мачавых шляхоў. Ускладняла сітуацыю і тое, што хлопчыку для таго, каб перасадзіць донарскі орган, неабходна было спачатку стварыць штучны мачавы пузыр, што і было зроблена за кошт кішэчніка. Толькі потым была праведзена аперацыя па перасадцы ныркі. Цяпер стан юнага пацыента стабільны.

**БЕЛТА.**

## Інтэрнаты павялічаць плошчы

**Да канца наступнага года ў Беларусі плануецца стварыць 50 дадатковых месцаў у дамах-інтэрнатах, а таксама 485 месцаў у аддзяленнях кругласутачнага знаходжання для пенсіянераў і інвалідаў пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла начальнік упраўлення ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання, інвестыцый і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марыя ГАРБАЦЭВІЧ.**

Паводле слоў Марыі Гарбацэвіч, на працягу 2007-2008 гадоў у краіне ўдалося стварыць 718 новых месцаў у інтэрнатах і 410 месцаў — у аддзяленнях кругласутачнага знаходжання. У выніку агульная чарга на пасяленне ў сацыяльныя ўстановы значна скарацілася. Але не знікла. Фактычна ва ўстановах яшчэ не хапае 832 месцаў, пры гэтым найбольшы дэфіцыт адчуваецца ў сталіцы і Гомельскай вобласці.

У сувязі з гэтым, адзначыла Марыя Гарбацэвіч, днямі прынятае рашэнне аб выдзяленні на развіццё ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання ў 2009—2010 гадах 76,4 млрд рублёў. Дзякуючы гэтаму чакаецца не толькі скарачэнне чаргі, але і павелічэнне колькасці інтэрнатаў, дзе плошча спальных памяшканняў адпавядае санітарнай норме — 7 квадратных метраў на чалавека. Плюс да таго, укладанні будуць рабіцца ў інфраструктуру сацыяльных устаноў, набыццё медыцынскага абсталявання і транспарту. У найбліжэйшы час прадугледжваецца фінансаванне работ у Дамачаўскім, Пінскім, Бабінавіцкім, Дунілавіцкім, Воранаўскім, Капаткевіцкім, Цярухскім дамах-інтэрнатах і шэрагу іншых устаноў. Пры гэтым значныя ўкладанні вызначаныя па найбольш «праблемнай» на сёння сталіцы. У планах па Мінску — рэканструкцыя і перапрафіляванне пад інтэрнат санаторыя-прафілакторыя «Світанак», пачатак будаўніцтва новага спальнага корпуса ў гарадскім псіханеўралагічным інтэрнаце № 3 і праектаванне дзіцячага дома-інтэрната.

**Сяргей ГРЫБ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання Януковіч Вандзе Фердзінантаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.**

# ГРАФ БЕНЯДЫКТ ТЫШКЕВІЧ ВЯРНУЎСЯ Ў БЕЛАРУСЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гледзячы на фота, варта памятаць умовы іх стварэння. Дзеля таго, каб зафіксаваць карцінку, трэба, каб яна была нерухомая мінімум хвіліну. Гэты напамін выклікае лёгкую ўсмешку, калі бачыш аўтапартрэт Тышкевіча. На ім граф стаіць у позе каратыста — задраўшы нагу дагары. Пры гэтым ён прасунуў пад нагой руку і п'е віно з бутэлькі. Відавочна, спадар Бенядыкт меў добрае пачуццё гумару — не баяўся выглядаць смешным сам (як на здымку з паляўнічымі мініятуркамі) і паказваць смешнымі іншых (сваіх сяброў пераапранаў для здымкаў у клоўнаў).

Калі я глядзеў на фота тагачасных беларусаў — людзей, якія нарадзіліся яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай, напалеонаўскіх войнаў — мне карцела параўнаць Тышкевіча з Напалеонам Ордам. Орда пакінуў нам бясцэнныя замалёўкі беларускай архітэктуры, а Тышкевіч — такія ж бясцэнныя здымкі нашых продкаў. І гэта шчасце, што граф меў такую шырокую душу, бачыў прыўкраснае ў сялянах. Бо звычайна ў тыя часы фатаграфавалі сямейныя сцэны князёў, урачыстасці, рабілі партрэты шляхты. Таксама нам пашчасціла, што граф любіў парадак — большасць здымкаў падпісаў сваёй рукой, пазначыў год і нават месяц стварэння працы. А галоўнае — месца: сядзіба Вялава. Кінуўшы вока на карту, атрымліваеш важкі аргумент у спрэчцы пра нацыянальнасць Тышкевіча.

Спадчына Тышкевічаў у Беларусі не спазнала літасці гісторыі і часу — палац у Лагойску разбураны, сядзіба Вялава стаіць у руінах, у валожынскім палацы месціцца аддзяленне міліцыі... Аднак здымкі Тышкевіча ўратаваліся і дайшлі да нас напраўду цудам не проста так. Яны — яскравы напамін таго, што толькі сваё, беларускае, нацыянальнае можа быць цікавым, можа застацца ў гісторыі. Яны — таксама сігнал нашаму сумленню: казачна багаты граф, які здзейсніў нават на сваёй яхце кругасветную вандроўку, захапляўся гэтым, а вы і ведаць не хочаце. Спяшайцеся на выставу ў Нацыянальны гістарычны музей. Граф Тышкевіч хоча нагадаць нам, што мы самабытныя беларусы.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота Бенядыкта ТЫШКЕВІЧА і Уладзіміра БАГДАНАВА.**



Сяляне, Вялава, верасень 1893.

**ДАВЕДКА**

*Музей Нісэфора Ньепса месціцца ў французскім горадзе Шалон-на-Соне (правінцыя Бургундыя). Нісэфор Ньепс (1765—1833), вынаходнік фатагаграфіі, акурат там нарадзіўся. У Музеі захоўваецца каля трох мільёнаў здымкаў розных часоў, а таксама 6000 прадметаў фотатэхнікі — ад часу яе вынаходніцтва да сённяшніх лічбавых фотаапаратаў. Асаблівасць музея (як і многіх французскіх) у тым, што вы можаце пабачыць любы экспанат, папярэдне патэлефанаваўшы ці напісаўшы туды ліст.*

*Чаму калекцыя Тышкевіча апынулася ў Францыі? Граф бавіў там шмат часу — яшчэ з дзяцінства. Меў у Францыі шмат маёнткаў, жыў там стала з 1883 года. Памёр таксама там, пахаваны ў сямейным склепе ў Ніцы.*

# ГУБЕРНАТАР КАЛІФОРНІІ ШВАРЦЭНЕГЕР ЗБІРАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСЬ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сам Аляксандр Усцінаў кажа, што планы правесці ў Мінску двубой за тытул чэмпіёна свету «віламі па вадзе напісаныя», але размовы такія сапраўды вядуцца.

*— Калі атрымаецца дамовіцца з кіраўніцтвам спартыўнага комплексу «Арэна», то двубой можа адбыцца. У Беларусі толькі гэта пляцоўка адпавядае стандартам правядзення паядынкаў такога ўзроўню, — тлумачыць баец.*

**— Ці сапраўды Арнольд Шварцэнегер збіраецца прыляцець у Беларусь спецыяльна на гэты паядынак? — пытаюся ў Аляксандра Усцінава.**

*— Такія знакамітасці, як Шварцэнегер, гатовыя вандраваць па ўсім свеце, каб назіраць за паядынкамі такога ўзроўню. Калі я баксіраваў у Нью-Ёрку, то сустрэў дзясяткі зорак, якіх да гэтага бачыў толькі ў галівудскіх стужках. Сустрэўся з Брусам Уілісам, але паразмаўляць з ім нармалёва не змог. На жаль, англійскай мовай я пакуль не валодаю, і гэта вялікая праблема.*

Ходзяць чуткі, што апроч Арнольда Шварцэнегера ў Мінск могуць прыляцець Сільвестар Сталонэ і Роберт Дэ Ніра.

У прамоўтарскай кампраніі K2 East Promotions, якой кіруюць браты Клічко і Вадзім Бухкалаў (менавіта яны займаюцца раскруткай Аляксандра Усцінава), інфармацыю пра прыезд у Мінск галівудскіх зорак пакуль не пацвярджаюць.

*— Зразумейце, гэта знакамітасці, пакуль усё не будзе вядома на 100 працэнтаў, нічога афіцыйна паведаміць не можам, — адкаментавала «Звяздзе» Таццяна, памочніца генеральнага дырэктара K2 East Promotions Вадзіма Бухкалава.*

Калі двубой у Мінску сапраўды адбудзецца, але не прыедзе Мікалай Валуеў, то супернікам Усцінава, хутчэй за ўсё, будзе 40-гадовы амерыканец Седрык Боусвел, той самы, з якім у Аляксандра не атрымалася пабіцца ў Лос-Анджэлесе.

**Яўген ВАЛОШЫН.**
**Фота з архіва Аляксандра УСЦІНАВА.**



***Люты 2009 года. Праз хвіліну УСЦІНАЎ (справа) атрымае тытул чэмпіёна Еўропы. Ці атрымаецца ў яго здабыць тытул чэмпіёна свету, пакуль невядома.***

## Шок амерыканцаў у Дацкім каралеўстве

**Менавіта ў такі стан прывяло дэлегацыю ЗША на чале з яе прэзідэнтам Баракам Абамам рашэнне выканкама Міжнароднага алімпійскага камітэта на нядаўнім кангрэсе ў сталіцы Даніі. А сутнасць вердыкту высокага сходу — аддаць права на правядзенне летняй Алімпіяды-2016 Бразіліі.**

Размова пра гэта ішла на ўчарашняй прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным алімпійскім камітэце Беларусі. Першы віцэ-прэзідэнт НАКа Генадзь Аляксеенка, які быў удзельнікам мерапрыемстваў у Капенгагене, зрабіў перад журналістамі сціслую справаздачу аб паездцы, дзе закраналіся праблемы алімпійскага руху. Усіх прысутных цікавіла рэакцыя амерыканцаў пры выбары алімпійскай сталіцы сярод чатырох гарадоў — Чыкага, Токіа, Мадрыда і Рыа-дэ-Жанейра, калі алімпійскі факел быў аддадзены ў Паўднёвую Амерыку, хоць першапачаткова фаварытам гэтай гонкі лічыўся Чыкага. Паводле слоў Генадзя Паўлавіча, горад ужо мае вялікую гатоўнасць для правядзення найважнейшых стартаў чатырохгоддзя, у дадатак да ўсяго выдатнай сталася прэзентацыя спартыўна-алімпійскіх аб'ектаў. Верагодней за ўсё, на адмоўную рэакцыю паважаных членаў МАКа паўплываў прыезд прэзідэнта ЗША Барака Абамы, хоць сцвярджаць гэта з абсалютнай упэўненасцю нельга. Тым не менш візіт спадара Абамы, «дзякуючы» яго целаахоўнікам, абмежаваў перамяшчэнне на Кангрэсе шаноўных і ўплывовых асобаў з МАК. Відаць, раздражніла іх і баражыраванне верталётаў у небе Капенгагена — зноў жа з нагоды прыезду новага прэзідэнта ЗША. Вось так Амерыцы было паказана, што вялікі спорт робіць вялікую палітыку.

У заключэнні гэтай сустрэчы Генадзь Аляксеенка ўручыў Пасведчанні спонсараў і партнёраў НАКа Беларусі прадстаўнікам шмат якіх айчынных прадпрыемстваў.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

**Фестывалі**

## Ранкам грошы — вечарам крэслы... ў глядзельнай зале

Купалаўскі тэатр фарміруе папячыцельскі савет — гэтая навіна была агучана на прэс-канферэнцыі з нагоды адкрыцця Міжнароднага фестывалю «Панарама». Як гэта атрымаецца насамрэч у нашых умовах — пакажа час. Але відавочна, што з Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы хочуць супрацоўнічаць спонсары, прынамсі, у правядзенні «Панарамы» арганізатарам акрамя дзяржаўных сродкаў была да месца дапамога «Белгазпрамбанка».

Прыезд некаторых тэатраў сапраўды каштаваў вельмі шмат. Таму кошт квіткоў на асобныя фестывальныя спектаклі даходзіць да 100 тысяч рублёў. Аднак у Мінску ёсць тэатральная публіка, якая ведае і разумее, што гэта сапраўды трэба глядзець. Квіткі пачалі прадаваць з канца жніўня, усе, хто хацеў, маглі купіць. Нават спектаклі беларускіх тэатраў, якія ёсць у рэпертуары, больш выклікалі цікавасць менавіта ў фестывальнай праграме, напрыклад, «Пінская шляхта». Вядома ж, найбольшую цікавасць выклікаюць замежныя госці. Тэатр з Мілана, напрыклад, свайго «Арлекіна...» паводле Гальдоні гатовы нават паказаць два разы. Квіток на дзённы спектакль міланцаў можна набыць за 35 тысяч.

— Усім тэатрам мы плацім ганарар, і немаленькі. Цуд тое, што гэта ўвогуле адбываецца цяпер, калі ўсе лічаць грошы, — адзначыў **мастацкі кіраўнік Купалаўскага тэатра Мікалай ПІНІГІН.** — Тэатр са Швейцарыі прывозіць пастаноўку Пітэра Брука — гэта апошні з магікан еўрапейскай рэжысуры! Спектакль «Чаму, чаму» будзе паказаны ў малой зале Палаца Рэспублікі. Прадстаўнік тэатра загадзя прыязджаў у Мінск, каб агледзець пляцоўку, на якой трэба будзе працаваць. Вось гэта сучасны падыход да арганізацыі тэатральнай справы.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**Апытанне**

## ЮРЫСТЫ — ПРЫБЫТКОВЫЯ, НАСТАЎНІКІ — НЕ

**Найбольш прыбытковай прафесіяй, па меркаваннях расіян, з'яўляецца юрыст. Так лічаць 14 % удзельнікаў апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі.**

На другім месцы апынулася прафесія прадпрымальніка — лічаць 13 % рэспандэнтаў, а на трэцім — банкіра (11 %). Па 8 % апытаных лічаць, што самымі «грашовымі» з'яўляюцца прафесіі эканаміста і дзяржаўнага служачага, яшчэ 7 % назвалі самай прыбытковай прафесію ўрача. Найменшы прыбытак прыносяць прафесіі настаўніка, спартсмена, інжынера, рыэлтара, а таксама мытніка. За прыбытковасць гэтых прафесій выказалася па адным адсотку рэспандэнтаў. Па прэстыжнасці прафесія юрыста таксама трапіла на першае месца, лічаць 20 %, на другім радку апынуліся ўрачы і эканамісты (па 12 %), на трэцім банкіры (7 %). Найменш прэстыжна, як лічаць расіяне, быць навуковым работнікам, працаваць у сельскай гаспадарцы, а таксама спартсменам, перакладчыкам або псіхолагам.



**Медсястра Ірына СІБІЦЕВА, Святлана АЗЕРСКАЯ і старшая медсястра Іна КАРЧ з нованароджанымі.**

Фота БЕЛТА.

*У Гродне нарадзіліся першыя ў гэтым годзе трайняты. Дзве дзяўчынкі і хлопчык з'явіліся на свет у Гродзенскім перынатальным цэнтры. Шчаслівымі бацькамі сталі **Святлана** і **Генадзь АЗЕРСКІЯ**. Для 34-гадовай Святланы гэта першая цяжарнасць, магчымай яна стала пасля аперацыі ЭКА. Стан нованароджаных і маці здавальняльны, адзначаюць медыкі.*

**Кампетэнтна**

# ВІРУС A/H1N1 НЕ МАЕ ПАНДЭМІЧНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК

**На думку загадчыка кафедры эпідэміялогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта , доктара медыцынскіх навук, прафесара Рыгора Чысценкі, вірус грыпу A/H1N1 пакуль не мае тых якасцяў, якія б маглі справакаваць маштабную пандэмію.**

— Я вельмі стрымана ацэньваю магчымасць высокага ўзроўню захваральнасці, — паведаміў на сустрэчы з журналістамі ў Мінгарвыканкаме Рыгор Чысценка. — Рэч у тым, што выклікаць буйную пандэмію можа толькі чалавечы вірус грыпу, які валодае дзвюма найважнейшымі характарыстыкамі. Па-першае, ён павінен актыўна размнажацца ў эпітэліяльных клетках слізістай верхніх дыхальных шляхоў і павінен мець актыўны механізм перадачы, гэта значыць, актыўна перадавацца ад чалавека да чалавека. Той варыянт віруса, які цыркулюе на планеце цяпер, не валодае ў поўнай ступені дзвюма згаданымі якасцямі. Спецыяліст выказаў таксама меркаванне, што распаўсюджванне ўзбуджальніка грыпу A/H1N1 тармозіць імунітэт, створаны ў нас ад сустрэчы з блізкароднаснымі яму ўзбуджальнікамі звычайнага сезоннага грыпу. Разам з тым, недаацэньваць небяспеку грыпу ні ў якім разе нельга, паколькі вельмі многія падзеі, звязаныя з біялогіяй вірусу (а першыя звесткі пра грып датуюцца яшчэ 1173 годам), невядомыя ці малавядомыя, што не можа не выклікаць у навукоўцаў занепакоенасці.

Між іншым, у еўрапейскіх краінах перайшлі ўжо ад лабараторнага пацвярджэння кожнага выпадку захворвання на грып A/H1N1 да маніторынгу за цыркуляцыяй вірусаў. Па словах загадчыцы аддзялення імуннай прафілактыкі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірыны Глінскай, у Беларусі хворыя з сімптомамі вострых рэспіраторных захворванняў і грыпу таксама не будуць падвяргацца суцэльнай лабараторнай дыягностыцы. Выбарачныя лабараторныя даследаванні праводзяцца ў нашай краіне як у перыяд сезоннага ўздыму захваральнасці на грып, так і ў міжсезонне. Зразумела, што ў перыяд сезоннага ўздыму захваральнасці колькасць ахопленых лабараторнымі даследаваннямі пацыентаў павялічваецца. Па словах Ірыны Глінскай, у верасні ў сталіцы распачаўся рост захваральнасці гараджан на вострыя рэспіраторныя інфекцыі. Калі ў летні час з праступнымі сімптомамі звярталіся ў медыцынскія ўстановы 5-7 тысяч чалавек за тыдзень, то цяпер гэта лічба вагаецца ў межах 9-12 тысяч чалавек. І ўсё ж такі гэтыя лічбы мала адрозніваюцца ад леташніх паказчыкаў, таму падстаў для хвалявання спецыялісты пакуль не бачаць. А прыходу эпідэміі медыкі чакаюць напрыканцы снежня ці ў пачатку студзеня — гэта крыху раней, чым у папярэднія гады. Як сведчаць звесткі лабараторнай дыягностыкі, у «вірусным пейзажы» цяпер пераважаюць адэнавірусы. А выпадкі захворвання мінчан на грып пакуль зарэгістраваны толькі адзінкавыя. Прычым размова ідзе пра звычайны сезонны грып. Новых выпадкаў захворвання мінчан на вірус грыпу A/H1N1 вызначана не было. Пакуль адзінай ахвярай новага вірусу грыпу стаў у сталіцы аспірант БДУ, грамадзянін КНР. Усе яго кантакты былі адсочаны. Далейшае распаўсюджванне вірус не атрымаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Абзац**

◢ Як адзначыў учора на прэс-канферэнцыі начальнік ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Андрэй Мехед, калі раней ваджэннем у стане алкагольнага ап'янення грашылі пераважна мужчыны, то ў апошні час насцярожвае рост падобных грубых парушэнняў ПДР жанчынамі. Так, у Брэсце ў сёлетнім верасні з 30 выяўленых п'яных вадзіцеляў апынулася 21 жанчына.

**◢ У Гомелі арыштаваны кіраўнік аднаго з таварыстваў з дадатковай адказнасцю, які абвінавачваецца ў махлярскай рэалізацыі маршрутак разам з маршрутамі перавозак пасажыраў у рэгулярных зносінах. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, уладальнік прыватнай фірмы, што ажыццяўляе пасажырскія перавозкі ў Гомелі і прыгарадзе, прапаноўваў зацікаўленым асобам набыць мікрааўтобусы разам з маршрутамі для наступнай працы на іх. Аднак у выніку пакупнікі засталіся без грошай і абяцаных аўтамабіляў. Распачата крымінальная справа.**

◢ Студэнт Белдзяржуніверсітэта не справіўся з кіраваннем аўтамабілем, у ДТЗ загінулі два пасажыры, яшчэ адзін дастаўлены ў бальніцу. На вуліцы Валадзько ў Мінску студэнт БДУ наехаў на асвятляльную мачту, у выніку чаго загінулі яго сябры — студэнт БНТУ і беспрацоўны 1990 г.н. Распачата крымінальная справа.

**◢ Пракуратура Заводскага раёна Мінска праводзіць праверку па факце смерці пацыента 5-й клінічнай бальніцы, які выкінуўся з акна. Мужчына 1950 г.н. быў дастаўлены ў бальніцу з мікраінфарктам. Раніцай яго цела ліфцёр бальніцы выявіў на вуліцы. Як мяркуецца, мужчына выкінуўся з 5-га паверха бальніцы.**

**Поўны абзац**

**◢ Урад Мальдыўскай Рэспублікі рыхтуецца да пасяджэння Кабінета Міністраў, якое пройдзе пад вадой на глыбіні 6 метраў 17 кастрычніка. Напярэдадні гэтай падзеі мальдыўскія міністры бяруць урокі падводнага плавання. Такім чынам яны паспрабуюць звярнуць увагу сусветнай супольнасці на праблемы глабальнага пацяплення і ўздыму ўзроўню марской вады. Прэзідэнт рэспублікі, нягледзячы на тое, што будзе старшынстваваць на пасяджэнні, не праходзіць навучання — ён з'яўляецца сертыфікаваным ныральшчыкам. Міністры будуць у вадалазных касцюмах, пры іх будзе ахова і персанальныя інструктары. Абменьвацца думкамі яны стануць пры дапамозе спецыяльных таблічак і жэстаў.**

◢ Суд Лондана прызнаў былога віцэ-мэра горада Іена Клемента вінаватым па справе аб растраце дзяржаўных сродкаў. Былы чыноўнік прыгавораны да 18 месяцаў турмы ўмоўна, а таксама да ста гадзін грамадскіх работ. Злоўжыванні былі дапушчаныя ў лістападзе мінулага года. Як вызначыла следства, Клемент тройчы аплачваў рахункі ў рэстаране, карыстаючыся службовай крэдытнай карткай. Урон, нанесены чыноўнікам, ацэньваецца ў 156 фунтаў стэрлінгаў. Першапачаткова ён адмаўляў факт нямэтавай растраты грошай, сцвярджаючы, што абедаў у рэстаранах з дзелавымі партнёрамі. Аднак у ходзе расследавання было выяўлена, што Клемент расходаваў бюджэтныя сродкі ў асабістых мэтах — абедаў са сваёй каханай, а таксама з неназванай начальніцай прэс-службы.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***


**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка**

| Наименование предмета аукциона | Здание производственного корпуса и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 61/1 |
| Продавец недвижимого имущества | РУПП «Барановичская обувная фабрика «Ритм», тел. (01634) 4 14 04 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание 3-этажное, панельное, 1998 г.п., площадь – 5746 кв. м. Земельный участок площадью 0,4278 га; срок аренды – 10 лет |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 2 086 416 272 |
| Сумма задатка, руб. | 208 600 000 |
| Организатор аукциона | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by** |

Аукцион состоится **10 ноября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 9 ноября 2009 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: возместить продавцу затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; возместить в республиканский бюджет расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 9 ноября 2009 года включительно.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже объектов республиканской собственности**

| Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке | **Лот № 1:** Капитальное строение инв. № 413/С-5324 (здание аптеки с пристройкой, погребом, холодной пристройкой, уборной, забором, калиткой, воротами и дорожкой), сарай инв. № 413/С-7927, расположенные по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, дер. Доброволя, ул. Урбановича, 71, и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0508 га сроком на 50 лет |
|---|---|
| | Начальная цена предмета аукциона 17 668 742 руб. Сумма задатка 1 766 000 руб. |
| Предмет аукциона, место нахождения имущества | **Лот № 2:** Изолированное помещение инв. № 440/D-3203 (помещения аптеки, сарай), расположенное по адресу: Гродненская обл., Ошмянский р-н, дер. Гольшаны, ул. Трабская, 10 |
| | Начальная цена предмета аукциона 27 418 356 руб. Сумма задатка 2 741 000 руб. |
| Продавец имущества | Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация» |
| Организатор аукциона | Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней) |

1. Аукцион состоится **19 октября 2009 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона по **15 октября 2009 года до 16.00**, кабинет 6.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549.

3. **По лоту № 1:** Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

4. **По лоту № 2:** Возмещение затрат на организацию и проведение результативных торгов осуществляется победителем торгов (претендентом на покупку) по фактическим затратам. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить в республиканский бюджет указанную сумму фактических затрат в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. После предъявления копии платежных документов о перечислении затрат на организацию и проведение торгов в установленном порядке в соответствии с условиями торгов между продавцом и победителем торгов (претендентом на покупку) в течение 2 рабочих дней заключается договор купли-продажи предмета торгов.

5. **Подробная информация** – в извещениях о проведении аукциона, ранее опубликованных в газете «Звязда» **19 августа 2009 г. № 154 (26512) и 26 августа 2009 г. № 159 (26517).**

Жаночае здароўе

# ЗЛЫЯ КЛЕТКІ Ў ЦЕЛЕ МАТКІ

**Рак цела маткі займае першае месца сярод анкалагічных захворванняў жаночых палавых органаў і пятае — сярод анкалогіі іншых органаў. Гэты від раку сустракаецца галоўным чынам у жанчын ва ўзросце 60—62 гадоў, аднак у апошнія гады пачаў сустракацца нават у 30-гадовых. Чаму так і што павінна ведаць кожная жанчына аб здароўі названага рэпрадуктыўнага органа? Расказвае загадчыца аддзела анкагінекалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Ірына КАСЭНКА.**



**— Чаму рак сустракаецца менавіта ў целе, а не ў самой матцы?**

— Таму што матка — гэта яе шыйка, цела і дно. У шыйцы маткі знаходзіцца, як вядома, цэрвікальны канал. Цела маткі, поласць трохвугольнай формы, аддзелена ад шыйкі звужанай часткай — перашыйкам. Верхняя частка маткі называецца дном. Сценка маткі складаецца з трох слаёў: унутранага — эндаметрыя, сярэдняга — мышачнага і вонкавага — серознага. Апошні выконвае абарончую функцыю. Што да мышачнага, то яго мышцы, як ні дзіўна, — самыя моцныя ў целе жанчыны, але яны дасягаюць поўнага свайго развіцця толькі да моманту родаў. Дзякуючы мышачнаму слою матка можа з 5 см павялічвацца ў даўжыню падчас цяжарнасці да 40 см. Пасля родаў матка вяртаецца да сваіх ранейшых памераў. Поласць маткі высцілае слізістая — эндаметрый, тканка, аналагічная той, што высцілае ротавую поласць. Розніца толькі ў тым, што слізістая маткі залежыць ад гарманальнага фону жанчыны. Штомесяц, як вядома, «старая» слізістая мяняецца на новую. Эндаметрый — асноўнае, дзеля чаго працуюць іншыя органы рэпрадуктыўнай сістэмы: яечнікі, гіпофіз, гіпаталамус. Гэта самастойная тканка забяспечвае імплантацыю і ранняе развіццё аплодненай яйцаклеткі.

Матка ўтрымліваецца ў арганізме некалькімі звязкамі. Іх размяшчэнне і мацаванне даволі складанае. Вось чаму жанчыне падчас цяжарнасці не рэкамендуецца высока ўзнімаць рукі. Гэта можа прывесці да напружання і зрушэння маткі, што здольна выклікаць заўчасныя роды.

Матачныя трубы звязваюць матку з брушной поласцю. Гэта значыць, што праз похву, шыйку маткі і матачныя трубы інфекцыя можа лёгка пранікнуць непасрэдна ў брушную поласць. Вось чаму нялечаныя гінекалагічныя хваробы, і ў першую чаргу інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, могуць прывесці да запалення брушыны — перытаніту.

**— Аднак калі цела маткі — гэта поласць паміж тканкамі дна і шыйкі, то дзе ж тады развіваецца рак?**

— Ва ўнутранай абалонцы — эндаметрыі. Рак эндаметрыя адпавядае раку цела маткі. Пухліна можа размяшчацца ў любым участку маткі, але часцей за ўсё пакутуюць дно і вуглы маткі. Пухліна можа мець выгляд паліпа, дробных разрастанняў з невялікім пашкоджаннем мышачнага слою або непасрэдна з эндаметрыя пераходзіць у мышачную і серозную абалонку.

Пры ўзнікненні раку ў целе маткі, з аднаго боку, узмацняецца размнажэнне клетак эндаметрыя, з іншага — рэзка прыгнятаюцца працэсы самастойнай гібелі клетак слізістай абалонкі, якая высцілае матку. У выніку парушэння гэтых двух працэсаў адбываецца бурны рост слізістай маткі і ўзнікае ўтварэнне, якое паступова прарастае ў мышцу маткі, крывяносныя і лімфатычныя сасуды. Ракавыя клеткі патокам крыві і лімфы распаўсюджваюцца па ўсім арганізме і становяцца крыніцай узнікнення другасных ачагоў пухліны — у лімфатычных вузлах, печані, касцях, лёгкіх, галаўным мозгу.

**— Што менавіта спрыяе ўзнікненню раку эндаметрыя?**

— Як правіла, развіццю пухліны папярэднічаюць гіперпластычныя працэсы, адэнаматоз — залішні рост эндаметрыя. Пачынаецца ўсё з функцыянальных парушэнняў, якія праяўляюцца высокім узроўнем гармонаў — эстрагенаў і адсутнасцю выспявання яйцаклеткі. Без своечасовага гарманальнага лячэння парушэнні фарміруюцца ўжо ў эндаметрыі і на гэтым этапе расцэньваюцца як фонавыя. Да іх адносяцца дыфузная і ачаговая формы гіперплазіі эндаметрыя. Пры адсутнасці лячэння фонавых захворванняў фарміруюцца тканевыя змяненні ў эндаметрыі, якія адносяцца ўжо да перадракавых. Гэта атыповая гіперплазія або адэнаматоз з атыпіяй, якія патрабуюць тэрміновага лячэння. Пры яго адсутнасці развіваецца злаякасная пухліна.

**— Ці праяўляецца як-небудзь ранні рак цела маткі або ў гэтым ён падобны на іншыя анкалагічныя захворванні?**

— Сапраўды, асаблівасцю гэтага віду раку з'яўляюцца сімптомы захворвання ўжо на першай стадыі. Што гэта за сімптомы? Вадкія выдзяленні ў жанчын любога ўзросту, крывяністыя — у постменапаўзе, бываюць падоўжаныя, узмоцненыя месячныя, міжменструальныя выдзяленні. У вельмі рэдкіх выпадках жанчына нічога «не адчувае».

**— Вядома, што з'яўленне любой злаякаснай пухліны абумоўлена спадчыннай схільнасцю да раку з аднаго боку, і знешнім уздзеяннем — з іншага...**

— Дакладныя прычыны ўзнікнення раку цела маткі не вызначаны. Аднак існуе меркаванне, што яго з'яўленню спрыяюць гарманальныя і абменныя парушэнні. Хоць пухліна можа ўзнікнуць і без яўных прыкмет гарманальных парушэнняў. Часцей жа праблема ёсць у жанчын з парушэннем вугляводнага абмену — хворых на цукровы дыябет, з сардэчна-сасудзістымі хваробамі, атлусценнем. Дарэчы, клеткі тлушчавай тканкі здольныя выпрацоўваць эстрагены, якія выклікаюць разрастанне многіх тканак у арганізме жанчыны, у тым ліку слізістай цела маткі. Вельмі часта развіццю раку цела маткі папярэднічаюць такія разрастанні слізістай органа, як паліпы і гіперплазіі, а таксама міёма маткі. Фонам для развіцця такіх станаў нярэдка становіцца хранічнае запаленне маткі — эндаметрыт, а таксама заражэнне хламідыйнай інфекцыяй. Фактарам рызыкі па ўзнікненні злаякаснага працэсу з'яўляецца і старэнне арганізма, зніжэнне яго імунных сілаў.

Важным момантам застаецца і няправільнае харчаванне. У прыватнасці, злоўжыванне канцэрагеннымі прадуктамі — вэнджанымі, з утрыманнем сінтэтычных харчовых фарбавальнікаў, жывёльнымі тлушчамі і недахоп вітамінаў, асабліва А, Е і С, мікраэлементаў. Свой шкодны ўнёсак забяспечвае і вострыя стрэс, які фарміруе ў галаўным мозгу ачаг узбуджэння, здольны парушыць баланс гармонаў. Адмоўную ролю адыгрывае і вірус папіломы чалавека, які быў выяўлены ў злаякасных новаўтварэннях эндаметрыя.

**— Якія метады абследавання для выяўлення раку цела маткі сёння прымяняюцца?**

— Эхаскапія — ультрагукавое даследаванне дазваляе агледзець матку, знайсці ў ёй пухліну, вызначыць памеры і ступень распаўсюджання. Існуе цыталагічнае і гістэраскапічнае даследаванне, біяпсія эндаметрыя, а таксама выскрабанне слізістай поласці маткі з адбіраннем участка зменёнай тканкі. Калі ў саскрэбе будуць знойдзены ракавыя клеткі, выстаўляецца дыягназ раку.

**— У чым заключаюцца асаблівасці лячэння?**

— Хірургічны метад — асноўны. Пры неспрыяльным прагнозе ён дапаўняецца дыстанцыйнай прамянёвай тэрапіяй органаў малога таза і перадаперацыйнай высакадознай кантактнай прамянёвай тэрапіяй — абпраменьваннем, пры якім ракавыя клеткі часткова гінуць, а часткова становяцца менш агрэсіўнымі. Пры неабходнасці лячэнне дапаўняецца хіміятэрапіяй.

**— Што менавіта выдаляецца пры раку цела маткі?**

— Матка з трубамі і яечнікамі, участак похвы. Пры пэўных асаблівасцях пухліны выдаляюцца некаторыя групы лімфавузлоў, паколькі ў іх найбольш часта з'яўляюцца даччыныя ракавыя клеткі.

**— Думаю, многія жанчыны гатовыя прыслухацца да ўсяго, што вы ім параіце...**

— Як бы банальна гэта ні прагучала, я ўсё ж такі нагадаю пра неабходнасць адпаведнай фізічнай нагрузкі і навучанне адэкватным мерам рэагавання ў стрэсавых сітуацыях. Што да рацыёну харчавання сучаснай жанчыны, то вынікі даследаванняў дазваляюць даць досыць канкрэтныя рэкамендацыі. Паводле звестак амерыканскіх даследчыкаў, трэць усіх злаякасных пухлін звязана з харчаваннем. Было вызначана, што ўжыванне вялікай колькасці тлушчаў, у тым ліку тлустых мяса і малака цесна звязана з захваральнасцю на рак тоўстай кішкі, малочнай залозы, цела маткі і прастаты.

Найбольшую колькасць прыродных супрацьпухлінных рэчываў утрымлівае гародніна, садавіна, зяленіва, таму іх рэкамендуецца ўжываць штодня. Морква, гарбуз, пятрушка, шпінат, кроп, шыпшына, чырвоны перац, зялёная цыбуля, памідоры, спаржа, абрыкосы, персікі багатыя на бэта-карацін і караціноіды, вядомыя як рэчывы, якія папярэджваюць развіццё пухлін. Харчовай крыніцай вітаміну А з'яўляюцца пячонка, рыба, масла, сыр, яйкі; вітаміну Е — алеі, зародкі пшаніцы, арэхі, рыба; вітаміну С — шыпшына, чорная парэчка, пятрушка, зялёны перац, капуста, лімон, апельсін, грэйпфрут. Існуюць пэўныя паведамленні і аб супрацьпухліннай актыўнасці такіх вітамінаў як, $B_6$, $B_9$, Д, Р, РР. Харчовымі крыніцамі вітаміну $B_6$ з'яўляюцца гарох, арэхі, авёс, вотруб'е злакавых, дрожджы, кукуруза, рыс, рыба; вітаміну $B_9$ — піўныя і пякарскія дрожджы, гарох, авёс, пятрушка, парасткі пшаніцы, вотруб'е злакавых, вінаград, лімон, соя, сачавіца. Вітаміны $Д_2$ і $Д_3$ паступаюць у арганізм з рыбіным тлушчам, сырам, яйкамі, сметанковым маслам. На вітамін Р багатыя шыпшына, чорныя парэчкі, цытрусавыя, брусніцы, вінаград, слівы, вішні, суніцы, морква, буракі. Вітамін РР, або нікацінавая кіслата ўтрымліваецца ў дражджах піўных і пякарскіх, пшанічным вотруб'і, зялёным гарошку, грэцкіх, рысавых і пшанічных крупах, бабовых раслінах, рыбе. Усе віды капусты, гарчыца, рэдзька, рэпа, хрэн, часнок, цыбуля ўтрымліваюць супрацьпухлінныя злучэнні глюказаналаты. У даследаваннях некаторых аўтараў даказана, што розныя віды капусты, часнок і цыбуля зніжаюць рызыку ўзнікнення раку ўсіх лакалізацый. Цытрусавыя — апельсіны, грэйпфруты, лімоны, мандарыны ўтрымліваюць супрацьпухлінныя монатэрпенавыя злучэнні. Вынікі даследаванняў сведчаць, што ўжыванне цытрусавых зніжае рызыку развіцця раку многіх лакалізацый. У соевых бабах, гароху, фасолі, сачавіцы ёсць супрацьпухлінныя поліфенольныя злучэнні. Значна больш нізкая захваральнасць на рак малочнай залозы, цела маткі, прастаты і тоўстай кішкі ў Кітаі і Японіі ў параўнанні з заходнімі краінамі звязваецца з большым — у 20—50 разоў — ужываннем соі і морапрадуктаў. Зялёная ліставая гародніна — пастарнак, пятрушка, сельдэрэй, кроп, шпінат, а таксама марскія водарасці ўтрымліваюць пігмент хларафіл, які зніжае рызыку развіцця раку ўсіх лакалізацый, але ў першую чаргу раку лёгкага, ротавай поласці, глоткі, стрававода, страўніка, тоўстай кішкі, малочнай залозы, мачавога пузыра.

Мікраэлементам, які валодае найбольш вядомым супрацьпухлінным дзеяннем, з'яўляецца селен. Найбольш яго выяўлена ў вотруб'і злакаў, пякарскіх і піўных дражджах, марскіх водарасцях і іншых морапрадуктах. У вялікай колькасці эксперыментальных работ было паказана супрацьпухліннае дзеянне селену на розныя органы жывёл.

**Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ШЛЯХ ДА СВЯТЛА

**У кожнага з нас свае жыццёвыя праблемы. Значнасць іх заўсёды розная: адзін пакутуе ад цяжкасці выбару маркі свайго чарговага новага аўтамабіля, другі пільна ўзіраецца ў кожны цэннік у прадуктовай краме і з болем у сэрцы вырашае, чаго ж сёння не атрымаецца набыць. Усё адносна. Як сказаў аднойчы Бальзак, «тамака, дзе ўсе гарбатыя, выдатная пастава становіцца выродлівасцю». Хаваючыся за адноснасцю, мы не заўважаем тых, каму яшчэ горш. Праблемы чалавека не абмяжоўваюцца машынамі ці прадуктамі харчавання. Існуюць рэчы і больш страшныя. Адна з іх — слепата...**



Ваню Цэдрыку два гадзікі. Ён, як і ўсе дзеці ў гэтым узросце, любіць гуляць на двары, смяецца, плача, просіцца да матулі на рукі. На першы погляд — дзіця, як дзіця, сотні і тысячы такіх маленькіх хлопчыкаў можна сустрэць кожны дзень. Але калі ўглядаешся ў яго вочы, разумееш, што нешта не так. Ваня не такі, як астатнія. З самага свайго першага дня на гэтым свеце ён бачыць перад сабою толькі цемру. Дыягназ — татальнае адслаенне сятчаткі. На аперацыю тэрмінова патрэбна вялікая сума. Для бацькоў хлопчыка яна непад'ёмная.

**У суботу, 17 кастрычніка,** новая веласіпедная траса ўздоўж Свіслачы стане пешаходнай. Хакейны клуб «Дынама-Мінск» разам з Федэрацыяй хакея Рэспублікі Беларусь арганізуе дабрачынную акцыю па зборы сродкаў для Вані. Кожны ахвотны можа пешшу прайсці 30 кіламетраў трасы побач са старшынёй федэрацыі Уладзімірам Навумавым і галоўным трэнерам мінскай каманды Глэнам Хэнланам. Перад пачаткам паходу будзе арганізаваны продаж фірмовых дынамаўскіх маек. Мінімальны кошт — 50 тысяч беларускіх рублёў. Максімальны — не абмежаваны. Першымі пакупнікамі маек стануць Навумаў і Хэнлан. Усе заробленыя сродкі пойдуць на Ваневу аперацыю. Пачатак акцыі **ў 9:00 на перакрыжаванні МКАД і ракі Свіслач каля вадасховішча Дразды**.

Мы ўсе марым аб вялікіх дасягненнях, хочам дамагчыся высокіх пасад, зарабляць добрыя грошы. Часам усё ж трэба спыніцца. Азірнуцца. Паглядзець у Ваневы вочы. Захацець, каб ён асэнсавана зірнуў у адказ. Усё ў тваіх руках. Дабрыня — гэта тое, што можа пачуць глухі і ўбачыць сляпы...

**Яўген ВАРАКСА.**

**ОАО «СТАРАЯ ФАБРИКА»**

(г. Минск) уведомляет кредиторов о том, что 29.09.2009 г. внеочередным собранием акционеров было принято решение

ОБ УМЕНЬШЕНИИ УСТАВНОГО ФОНДА ОБЩЕСТВА

Уставный фонд Общества с размера 122 240 000 (сто двадцать два миллиона двести сорок тысяч) белорусских рублей уменьшен на сумму номинальных стоимостей аннулированных 4104 (четыре тысячи сто четыре) штук простых (обыкновенных) акций номинальной стоимостью 1000 белорусских рублей и утвержден в размере 118 136 000 (сто восемнадцать миллионов сто тридцать шесть тысяч) белорусских рублей. Уставный фонд Общества сформирован в полном объеме.

**220030, г. Минск, ул. Октябрьская, 19, тел./факс 227 73 00.**

УНП 100640022

**Утерян бланк** строгой отчетности по ОСГО ВТС РБ: страховой полис АЖ 8792286. Указанный бланк строгой отчетности **считать недействительным**.

Як нас дураць

# ПРАДАМ СЛОІК... ПОПЕЛУ. ДОРАГА!

**Уласны карэспандэнт «Звязды» па Віцебскай вобласці спрабаваў дапамагчы даверліваму жыхару глыбінкі прадаць тытунёвы попел. Для аказання рэальнай дапамогі рэпарцёру «Звязды» давялося цярпліва і ўважліва вывучаць «папяловую тэму» на «чорным рынку» і нават выйсці на патэнцыйных закупшчыкаў попелу ў суседняй дзяржаве — брацкай Украіне. Атрымалася ўсё гэта не без цяжкасцяў і не за адзін дзень.**

«Прадам слоік попелу. Дорага!» Спачатку, калі ўбачыў такія аб'явы на дошках паведамленняў, падумаў, што жарт. Нават ад душы пасмяяўся. Навошта прадаюць гэты самы попел? Хто? І хто ў яго (яе) попел купіць? Потым аналагічную аб'яву ўбачыў на папулярным рэгіянальным інтэрнэт-сайце.

Звязаўся з прадаўцом. Папрасіў у мяне мужчына... да 50 умоўных адзінак за... 100 грамаў. І з умовай, што можна цану панізіць, калі куплю насамрэч. А ў яго амаль аж літровы слоік попелу. Гэта ж колькі грамаў змесціцца ў літровы слоік? Не слаба?

І што мне потым з гэтым «багаццем» рабіць, калі насамрэч яго купіў бы? Прадавец попелу катэгарычна адмовіўся адказаць на канкрэтнае пытанне — што ён сам будзе рабіць з попелам, які я ў яго не куплю? І адкуль такая касмічная цана ўзялася? Ён адказваў без асаблівага энтузіязму. Маўляў, а што вам за справа? Купляйце, а астатняе вас не хвалюе...

Але ж калі ён пачуў, што я з рэдакцыі газеты, тым больш рэспубліканскай, якую ён ведае і чытаў, шчыра папрасіў яму дапамагчы. Расказаў, што пачалося ўсё з таго, што ягоны знаёмы параіў збіраць попел, бо і сам неаднаразова паспяхова яго прадаваў. А потым, як паехаў у Расію, так і на сувязь не выходзіць. Відаць, вельмі заняты на працы. А мо проста пажартаваў за чаркай. І мой новы знаёмы — гандляр попелам у выніку цяпер самастойна шукае таго, каму прадаць не вельмі распаўсюджаны, скажам так, тавар.

Каб дапамагчы, звязваюся з рознымі інстанцыямі. Мо пачалі ў нас купляць попел? У падатковай інспекцыі Віцебскай вобласці спачатку вельмі здзівіліся маёй просьбе пракаментаваць нешта па тэме. Адназначна канстатавалі, што ніхто з прадпрымальнікаў, тым больш ніякія фірмы, не заяўлялі пра ажыццяўленне такога нестандартнага віду закупнай дзейнасці.

Афіцыйна ў беларускіх аптэках тытунёвы попел не купляюць. Таксама праверана ў размовах з прадстаўнікамі фармацэўтычных структур.

Дык усё-такі, хто купляе попел і што потым робяць з попелам пакупнікі?

Дарэчы, не выключаецца, што наш прадавец проста мог бы вельмі лёгка трапіць на вуду махляроў, калі б самастойна спрабаваў прадаць попел. Як і ягоны знаёмы. Ці апошні сам — не вельмі сумленны чалавек?

Пакупка попелу можа быць чарговым і вельмі нестандартным відам махлярства. Колькі іх ужо вядома — сотні!

Калега з Пскоўскай вобласці, між іншым, расказваў, што ў Расіі такім чынам некаторыя зладзеі зарабляюць падманам. Просяць, напрыклад, у якасці пацвярджэння таго, што вы дарослы і маеце права паліць (здаваць попел), выслаць «трохі» расійскіх рублёў: 200 — 300, а таксама копію ліста пашпарта, дзе пазначаная дата, месяц і год нараджэння.

А яшчэ могуць даць рэкламнае паведамленне пра тое, што купляюць попел, а самі будуць потым проста прапаноўваць купіць у іх нумар кантактнага тэлефона фірмы і дакладны адрас. У нас, наколькі я ведаю, такога крымінальнага бізнэсу яшчэ не назіралася.

Ці выкарыстоўваецца попел у народнай медыцыне? Мо знахары купяць? Як растлумачыў знаёмы спецыяліст па нетрадыцыйных старадаўніх метадах лячэння Анатоль Захарэнка, попел насамрэч паспяхова выкарыстоўваецца пры лячэнні. Але часцей за ўсё не тытунёвы. У старадаўнія часы, калі ў нас яшчэ наогул не ведалі, што такое тытунь, лячылі раны попелам дрэваў: дуба, ліпы. Спальвалі да галавешак, потым «мялі» і парашок выкарыстоўвалі для хутчэйшага загойвання ран. Вядома, і тытунёвы попел мае па-свойму лячэбны эфект.

Знахар лічыць: не выключаецца, што попел купляюць для прымянення ў народнай медыцыне. У буйных гарадах Расіі альтэрнатыўнае, так званае знахарскае лячэнне, як гаворыцца, пастаўлена на паток. І попел можа ў вялікіх памерах выкарыстоўвацца для прыгатавання самых розных лекавых сродкаў.

І герпес можа прайсці, калі, напрыклад, цёплы попел прыкласці да вуснаў. А калі ён падагрэты з іншымі травамі, эфект вельмі добры. Пякотка праходзіць, калі трохі попелу з'есці.

Хоць, на думку віцебскага лекара, наўрад ці тыя ж маскоўскія знахары будуць плаціць вялікія грошы, тым больш за партыі попелу. Калі ўжо так спатрэбіцца, прапануюць папрасіць хворых пацыентаў трохі попелу «пазычыць» у знаёмых, калі хворыя самі не кураць.

У інтэрнэце, як высветлілася, насамрэч вельмі шмат прапаноў аб продажы попелу. Ёсць, што цікава, і прапановы аб куплі. Часцей за ўсё сустракаецца цана 570 — 580 расійскіх рублёў за грам. Звязваўся. Тэлефоны маўчалі. Толькі адна «пакупніца» прызналася, што яна працуе за «працэнты». Калі растлумачыць проста, бярэ дзесяць працэнтаў ад кошту попелу. І гэтыя грошы просіць выплаціць ёй адразу за «кансультацыйную паслугу». Усё зразумела?

Мне пашанцавала нікому не плаціць за інфармацыю. Знайшоў самастойна назву фірмы, якая быццам бы купляе ў насельніцтва попел, — прыватная кампанія «Эдэльвейс». Займаецца фірма бізнэсам у сферы фармацэўтыкі. І кантактныя нумары тэлефонаў адшукаў. Праўда, чамусьці напісаныя яны пад прапановамі купіць попел не ў міжнародным тэлефонным стандарце.

Высветлілася, што знаходзіцца фірма ў горадзе Львове.

Тэлефаную настойліва і доўга. Раз, два, тры, ужо дзясяты раз. Усё заняты такі жаданы для мяне і бедалагі — гандляра попелам — нумар. Мо не той нумар набіраю?

Па даведку звяртаюся ў беларускую ўсім вядомую тэлефонную службу «109». Аператар выдае мне тэлефон калег са службы «153», якая адказвае за міжнародныя даведкі. Там мне далі тэлефон ужо даведачнай тэлефоннай службы горада Львова.

Жанчына — аператар тэлефоннай даведкі ў Львове дае мне дакладны нумар офіса названай фірмы. Тэлефаную.

Цуд. З першага разу без усякіх праблем выйшаў на сувязь. Дзяўчына, я так зразумеў, з прыёмнай адразу параіла патэлефанаваць у аддзел забеспячэння прадпрыемства. Там, маўляў, адкажуць на ўсе пытанні падрабязна.

У названым аддзеле яшчэ адна дзяўчына весела павіталася па-ўкраінску. На пытанні наконт попелу (гаварыў я па-руску) адказвала, што наогул не разумее, што ж мне ад яе трэба.

— Попел (ужо па-беларуску) паўтараю пытанне. Попел!!! Прадаю! Я з Беларусі. Як вам адправіць попел? Па пошце? Як грошы за той самы попел атрымаць? — крычу ў трубку.

— Так, зразумела, вы пытаеце пра попел, — урэшце разумее мяне супрацоўніца. — Не... Не займаемся мы купляй попелу і раней гэтага не рабілі. Ды і не збіраемся! Гэта, напэўна, нейкая памылка.

Можна сказаць, што віцебскаму няшчаснаму прадаўцу попелу яшчэ пашанцавала. Грошы ён за «папяловыя кантакты» яшчэ нікому адправіць не паспеў. А прапаноў наконт пакупкі попелу, як высветлілася, многа ў «віртуальным павуцінні». І, ужо праверана, не за «дзякуй» дапамогуць прадаць попел.

Работнікаў фірмы ў Львове шчыра шкада. Напэўна, штодня ім тэлефануюць усякія розныя прадаўцы попелу. Такія ж дурні, як я.

Ці гэта добры рэкламны ход? Тым больш што на сайце фірмы прапаноўваецца супрацоўніцтва па розных пытаннях.

А мо зладзеі нейкія проста «падстрахоўваюцца» — вось вам канкрэтная фірма, а мы — «прадстаўнікі». Сядзяць людзі недзе ў той жа Маскве ды грошыкі зарабляюць, а ў фірме, верагодней за ўсё, пра іх дзейнасць і не ведаюць.

Няўжо мы, дарослыя людзі, часта забываем пра тое, што магчымасць лёгкага заробку — гэта проста падман? І, як дзеці, часта верым у казкі пра той жа попел. Ці не лепш «Папялушку» перачытаць?

Людзі любяць, калі іх падманваюць, — аднойчы сказаў мне мой добры знаёмы віцебскі ілюзіяніст. І меў рацыю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «НІЧЫЙНЫЯ» БУДМАТЭРЫЯЛЫ

З гарадской плошчы ў Чачэрску, дзе праводзіліся рамонтныя работы, раптам знікла 310 тратуарных плітак і 6 блокаў бардзюрнага каменю на агульную суму больш за 600 тысяч рублёў. Было выяўлена, што перацягаў будматэрыялы ў іншае месца непрацуючы 35-гадовы грамадзянін.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Продаются акции простые (обыкновенные) ЗАО «ПАН Маркет» в количестве 35 штук.**

Стоимость одной акции устанавливается в размере 330 000 долларов США для нерезидентов Республики Беларусь. Стоимость одной акции для резидентов Республики Беларусь равна сумме в белорусских рублях, эквивалентной 330 000 долларов США по курсу, который равен курсу продажи наличного доллара США в обменных пунктах ОАО «Белагропромбанк» на дату оплаты.

Преимущественное право на покупку указанных акций в течение определенного срока имеют акционеры и само Общество. Дополнительную информацию об условиях продажи акций и о ЗАО «ПАН Маркет» можно получить по телефонам: + 375 29 3495166 и +375 29 777 17 10. Заявки на приобретение акций рассматриваются до 25.11.2009 года.

**Адрес для направления заявок и иной почтовой корреспонденции: 220131, г. Минск, а/я 409.**

Былы міністр сельскай гаспадаркі Літвы:

# «Шкадую, што мы развалілі калгасы»

Карэспандэнт «Звязды» надзеў «кухвайку» і галошы ды праехаўся па фермах суседняй Літоўскай Рэспубліцы. Высветлілася, што тамтэйшыя аграрыі жывуць лепш за гараджанаў

Прадукты сельскай гаспадаркі маленькай Літоўскай Рэспублікі славяцца яшчэ з савецкіх часоў. Ну, хто з гурманаў не каштаваў, скажам, знакамітых літоўскіх сыроў? Ды нават свой хлеб літоўцы разрэкламавалі так, што яго прадаюць і ў Польшчы, і ў Нямеччыне. А кошты на прадукцыю ў літоўскіх крамах па многіх пазіцыях ніжэйшыя за нашы. Дзе-дзе, а ў галінах сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці з Літвы варта браць прыклад многім.

— Сёння справы ў сельскай гаспадарцы ідуць сапраўды някепска, — прызнаецца **былы міністр сельскай гаспадаркі Літвы Яронімас КРАЎЕЛІС**. — Калі ўвайшлі ў Еўрапейскі саюз, высветлілася, што прадукцыя адпавядае ўсім нормам, а то і лепшая. А кошты на літоўскую прадукцыю малочнай ці мясной вытворчасці — на 40 працэнтаў ніжэйшыя, чым у тых жа французаў, немцаў, датчанаў. Таму на пастаўкі літоўскіх прадуктаў увялі некаторыя квоты. Інакш мы маглі захапіць немалую долю рынку.



Яронімас КРАЎЕЛІС задаволены заробкамі літоўскіх аграрыяў, але лічыць, што магло б быць і лепш.

Трэба сказаць, што спадар Яронімас Краўеліс займаў пасаду міністра ў канцы 90-х гадоў. А сёння ён — старшыня Асацыяцыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Літвы, своеасаблівага прафсаюза аграрыяў. Спадар Яронімас прызнаўся, што ўжо гадоў дваццаць не размаўляў па-руску, але ветліва адказваў на мае пытанні.

> **Калгасы параскідалі! Здаралася, калгасныя забудовы разносілі па цаглінах.**

— Хоць у пачатку 90-х, калі Літоўская Рэспубліка стала незалежнай краінай, праблемы ў нас былі сур'ёзныя, — узгадвае Яронімас Краўеліс, эмацыйна развёўшы рукі ўбакі. — Калгасы параскідалі! Здаралася, калгасныя забудовы разносілі па цаглінах. А сёння ў нашай сярэдняй гаспадарцы прыкладна 18 гектараў зямлі. Нават сорамна сказаць — у сярэднім тры каровы на гаспадарку выходзіць.

Словам спадара Яронімаса Краўеліса я шчыра здзівіўся:

***— Чаму тады літоўскія сяляне сёння так добра жывуць?***

— Вядома і буйных гаспадарак у нас нямала. Яны мадэрнізаваныя, атрымліваюць добрую дапамогу ад Еўрапейскага саюза і нашага ўрада. Але і тут, на наш погляд, не ўсё справядліва. Літоўскі фермер атрымлівае 51 еўра дапамогі на тону збожжа, якую ён вырошчвае. Калі ў пачатку двухтысячных уводзілася гэта норма, у нас праходзілі рэформы, рэарганізацыі, паказчыкі былі невысокія. А сёння ў некаторых гаспадарках паказчыкі выраслі ў разы, а дапамога ўсё тая ж. Таму ў параўнанні з фермерамі Францыі, напрыклад, мы ў няроўных умовах.

## «Ваш «Беларус» — добры трактар, за 10 гадоў не паламаўся»

Спадар Яронімас Краўеліс як сумленны чыноўнік многае ў развіцці сельскай гаспадаркі Літвы хваліў, а многае і крытыкаваў. Ды поспехі літоўскіх аграрыяў пры гэтым меншымі не робяцца. У ваколіцах Вільні і Каўнаса я праехаўся па тыповых буйных гаспадарках. Вось адна з іх.

Заязджаю ў вёску Аткочай, што ў 85 кіламетрах ад сталічнай Вільні. І бачу перад сабой — ну, самы звычайны беларускі калгас. Такія ж кароўнікі, як у нас, такія ж бункеры для сушкі збожжа, такія ж гаспадарчыя пабудовы.

— Лабадзена, — прывітаўся са мной мясцовы заатэхнік Гедымінас, а калі даведаўся, што я з Беларусі, перайшоў на ламаную рускую мову. — Яшчэ ў 80-х гэта быў калгас імя камуністычнага пісьменніка Караліса Пажэлы. А сёння — наша гаспадарка, называецца «Аткочай аграсэрвіс». Маем 2500 гектараў зямлі і вырошчваем усе збожжавыя культуры. Намалоты — каля шасці тон з гектара.

Пахадзіўшы па гаспадарцы, не змог адразу знайсці адрозненняў ад беларускага СВК. Раптам на вочы мне трапляюцца замежныя трактары жоўтага колеру.

— Гэта «Кейсы» і «Джон Дзіры», вельмі добрыя трактары, — хваліцца Гедымінас.

— Што ж вы нашы трактары не купляеце, мы ж суседзі— — пытаюся ў заатэхніка. — Універсальны «Беларус-82» 15,5 тысячы долараў у нас каштуе.

— Ведаю, што вашы трактары добрыя, у самога ёсць маленькі «Беларус», дзесяць гадоў карыстаюся, амаль не ламаўся, — адгаворваецца Гедымінас. — Але купляць вашы трактары нам ніхто не прапаноўвае. Няхай бы праехаліся ўладальнікі вашага завода па нашых прадпрыемствах ды парэкламавалі. Тады б, упэўнены, прадалося б нямала трактароў.

## Беларускія цялушкі нам не па душы

Каровы, якія гадуюцца ў «Аткочай аграсэрвіс», для беларускага вока незвычайныя. Мычаць як каровы, а знешне на нашых чорна-пярэстых мала чым падобныя.

— Гэтыя белыя — французскія «шарле», — працягвае Гедымінас экскурсію. — А карычневыя з белымі галовамі — англійскія «герафорды». Спецыяльныя мясныя пароды, малака з іх столькі ж, як з казла.

Калі я расказаў, што ў Беларусі па-ранейшаму папулярныя цялушкі чорна-пярэстай пароды, Гедымінас адмоўна паківаў галавой. Усміхаўся заатэхнік і тады, калі я пачаў расказваць пра беларускую бітву за ўраджай:

— Пагадзіся, Гедымінас, ну, як можна пражыць, калі не ведаеш, хто колькі намалаціў? Ды і «Дажынак» у вас няма. Непарадак.

— Даўно я не бываў у Беларусі, — унікнуў ад адказу далікатны Гедымінас. — А вашы «Дажынкі» сам хацеў бы пабачыць. Спадзяюся, беларускія аграрыі з літоўскімі надалей будуць больш абменьвацца досведам.

**Яўген ВАЛОШЫН.**
*Мінск—Вільня—Каўнас—Мінск.*
**Фота аўтара.**

**КОЛЬКІ ЗАРАБЛЯЮЦЬ ЛІТОЎСКІЯ ПРАЦАЎНІКІ ПАЛЁЎ**

**— Самы звычайны мой рабочы мае ў сярэднім 570 долараў штомесяц, — кажа дырэктар гаспадаркі «Аткочай аграсэрвіс» Валдас Лапукас. — А механізатар — каля 630 долараў. Амаль усім мы дапамаглі правесці ў дамах хуткасны інтэрнэт. Праўда, дысцыпліна ў нас строгая, ужываць алкаголь забаронена.**

**У Асацыяцыі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Літвы карэспандэнту далі звесткі па ўсёй краіне за 2008 год. Літоўскі працаўнік палёў мае ў сярэднім 370 долараў ЗША штомесяц. Гэта больш, чым у сярэдняга гарадскога жыхара (каля 360 долараў).**

**Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, наш калгаснік зарабляў у 2008 годзе ў сярэднім 563 тысячы рублёў у месяц (на той час каля 255 долараў).**



Цялушкі «шарле», якіх я пабачыў у літоўскім кароўніку, не даюць малака і ўсе пойдуць на каўбасу.

